горадзе дзяржінспектарам райздраўаддзела, затым — загадчыцай дзіцячых ясляў № 1, фельчарам, рэнтгеналабарантам. Добра ведаюць Галіну Канстанцінаўну ў горадзе па яе грамадскай дзейнасці, яна неаднаразова выбіралася старшынёй жаночага савета пры райваенкамаце.

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Г. К. Патоцкая — актыўны арганізатар гарадскога хору ветэранаў, які зараз носіць званне «народны». У 1995 г. Галіна Канстанцінаўна стала ганаровым грамадзянінам Мазыра.

Былая партызанка ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі, Ганаровымі граматамі.

Падрыхтавала
*Т. Пілінчук*

А. П. Эльман



**Эльман Андрэй Пятровіч** (н. у 1903 г. у г. Елабуга Вяцкай губерні). Працоўную дзейнасць пачаў у 1919 г. Працаваў у камсамольскіх і партыйных органах у Віцебску і Гомелі. Скончыў Інстытут чырвонай прафесуры пры ЦВК СССР. У 1937 — 1939 гг. — дырэктар Гомельскага педагагічнага інстытута, з 1940 г. — сакратар Гомельскага, Беластоцкага, Новасібірскага, Гродзенскага абкамаў КПБ. У 1948 г. — намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. У 1949 — 1952 гг. — намеснік старшыні Палескага аблвыканкама, у 1952 — 1968 гг. — дырэктар, рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута. У сувязі з 90-годдзем з дня нараджэння А. П. Эльману прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Мазыра.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр у студзені 1995 г.

*В. Шур*

## Тут іх карані

Многія ўраджэнцы Мазыршчыны праславілі свой палескі край, жывучы і працуючы далёка ад роднага дому. Гэта знакамітыя вучоныя і дзеячы культуры, відныя военачальнікі, вядомыя спартсмены...

### Ад каваля да акадэміка

У старажытнай вёсцы Барбароў пачынаў у 20-я гады сваю працоўную дзейнасць Міхаіл Мацапура. Тут на землях мясцовага памешчыка Горвата гнулі спіны яго бацькі, тут у 1909 г. нарадзіўся будучы акадэмік. З малых гадоў ён цягнуўся да кавальскай справы, працаваў малатабойцам, памочнікам каваля, зімой вучыўся ў школе.

У 1932 г. Міхаіл Мацапура скончыў Ленінградскі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Яшчэ ў студэнцкія гады ён імкнуўся ўдасканальваць і ствараць новыя віды машын. Гэта і прывяло маладога інжынера ў Маскву, дзе ён стаў загадчыкам лабараторыі машын па вырошчванні і перапрацоўцы бульбы УНДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У 1945 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю па праблемах сельскагаспадарчага машынабудавання, з 1947 г. — акадэмік Акадэміі навук БССР. У гэтым жа годзе Міхаіл Яфрэмавіч назначаны дырэктарам Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай



М. Я. Мацапура

гаспадаркі нечарназёмнай зоны СССР. Многа гадоў аддаў навуковай рабоце па вырашэнні праблем землеробчай тэхнікі, стварaў новыя сельскагаспадарчыя машыны.

У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі пачаліся вялікія работы па асушэнні і асваенні беларускіх балот. Тут вельмі дарэчы аказаліся плужныя канавакапальнікі, балотныя плугі, створаныя ў інстытуце пад кіраўніцтвам М. Я. Мацапуры. Старэйшае пакаленне аграрнікаў Беларусі памятае мацапураўскія плугі, з дапамогай якіх асвоены і ўведзены ў севазварот першыя тысячы гектараў забалочаных зямляў. Намнога пазней на балотах з'явіліся новыя ўдасканаленыя меліярацыйныя машыны.

За вялікі ўклад у распрацоўку праблем землеапрацоўчай тэхнікі М. Я. Мацапура быў узнагароджаны многімі высокімі ўрадавымі ўзнагародамі, ён тройчы ўдастоены звання лаўрэата Дзяржаўнай і Ленінскай прэмій, чатыры разы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Памёр М. Я. Мацапура ў 1971 г.

Памяць пра славутага земляка, колішняга каваля з Барбарова, выдатнага вучонага, які смела і настойліва пракладваў у навуцы і тэхніцы свой адметны шлях, жыве на Мазыршчыне. У роднай вёсцы М. Я. Мацапуры адна з вуліц названа ягоным іменем.

*М. Капач, В. Шур*

## Жыццё ў навуцы

**Ракіцкі Пётр Фаміч** (н. 2.8.1903 г. у в. Кустаўніца) — вучоны ў галіне агульнай біялогіі, генетыкі і селекцыі. Акадэмік АН БССР, доктар біялагічных навук. Скончыў Маскоўскі універсітэт імя Ламаносава, працаваў у шэрагу навукова-даследчых устаноў рэспублікі. Апошнія гады жыцця загадваў лабараторыяй тэарэтычнай генетыкі Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. П. Ф. Ракіцкі сфармуляваў і эксперыментальна абгрунтаваў паняцце аб полі дзеяння гена, упершыню ў краіне пачаў даследаванні па рацыянальнай генетыцы млекакормячых. Ён распрацаваў шэраг пытанняў генетыкі колькасных прыкмет і генетычных асноў селекцыі жывёл. З'яўляўся прэзідэнтам Беларускага таварыства генетыкаў і селекцыянераў імя Вавілава. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

### З успамінаў П. Ф. Ракіцкага

Да шасцігадовага ўзросту я жыў разам з маці ў Кустаўніцы (цяпер гэтай вёскі няма, на яе месцы пабудаваны Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод). У памяці — пераправа ранняй вясной цераз Прыпяць, пацямнелы лёд...

Перад першай сусветнай вайной мы пераехалі ў Мазыр, мне трэба было вучыцца. Жылі мы на вуліцы Свідоўка. Нядаўна, прыехаўшы ў Мазыр, я адшукаў той дом, дзе мы кватаравалі з 1913 па 1915 год. Мазыр я вельмі любіў — за яго ўзгоркі і яры, месцы дзіцячых гульняў, Прыпяць і прыбярэжны пясок.

Напярэдадні рэвалюцыі мы пераехалі ў Чэрыкаў. Там М. Н. Лепяшынскі, брат вядомага рэвалюцыянера-бальшавіка П. Н. Лепяшынскага, арганізаваў у 1920 г. у былым маёнтку Лемень школу-камуну другой ступені, якая потым называлася доследна-паказальнай. Я быў у першым яе выпуску, і М. Н. Лепяшынскі прапанаваў мне, 18-гадоваму юнаку, застацца ў камуне настаўнікам. На працягу двух гадоў выкладаў біялогію, якой захапляўся з дзяцінства. Пасля работы ў Лемені ў 1923 г. паступіў у Маскоўскі універсітэт.

Яшчэ студэнтам я пачаў весці навуковую работу ў інстытуце эксперыментальнай біялогіі пад кіраўніцтвам выдатных вучоных Н. К. Кальцова і С. С. Чацверыкова. Там на пачатку 30-х гадоў напісаў вялікую кнігу — першы савецкі падручнік генетыкі для ВНУ, а ва ўзросце 36 гадоў у Маскоўскім універсітэце абараніў дысерта-



П. Ф. Ракіцкі



А. І. Захарава

цыю, стаў доктарам біялагічных навук, прафесарам.

У 1960 г. мяне запрасілі ў Мінск загадваць кафедрай заалогіі пазваночных Беларускага універсітэта. Я з радасцю пераехаў, мяне ніколі не пакідала пачуццё горычы, што я адарваўся ад Беларусі. Нягледзячы на ўзрост, многа пішу, друкую артыкулы, выступаю з дакладамі. Паранейшаму займаюся матэматычнымі пытаннямі генетыкі, штучным выкліканнем спадчынных змяненняў уздзеяннем радыяцыі і хімічных рэчываў, пошукам ахоўных сродкаў ад уздзеяння радыяцыі. Удзяляю ўвагу тэарэтычным пытанням селекцыі сельскагаспадарчых жывёл. Работы многа, цікавай і карыснай, спадзяюся яшчэ нямала зрабіць і здзейсніць...

**Захарава Алена Іванаўна** (н. у 1907 г. у Мазыры) — доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. З 1943 г. працавала ва Усерасійскім навукова-даследчым інстытуце вінаградарства і вінаробства ў Новачаркаску.

Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1951, 1971), аўтар больш як 200 кніг, брашур, артыкулаў, рэкамендацый па вінаградарстве і вінаробстве. Мае пяць аўтарскіх пасведчанняў за распрацоўкі па вінаградарстве. Узнагароджана трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалямі.

**Некрашэвіч Ілья Рыгоравіч** (н. 20.7.1905 г. у Мазыры) — беларускі фізік, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі. Скончыў Белдзяржуніверсітэт і Маскоўскі універсітэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у БДУ загадчыкам кафедры фізікі, у фізіка-тэхнічным інстытуце АН БССР. Працы па фізіцы кантактаў металаў з паўправаднікамі і з газаразраднай плазмай. Выявіў частотную інверсію выпрамлення пераменных токаў высокай частаты пунктавым кантактам паўправадніка з металам.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

**Піліпенка Уладзімір Аляксандравіч** (н. 18.5.1949 г. у Мазыры) — вучоны ў галіне электронікі, доктар тэхнічных навук. У 1971 г. скончыў факультэт радыёфізікі і электронікі Белдзяржуніверсітэта. З 1971 г. працаваў у СКТБ вытворчага аб'яднання «Інтэграл», вядучы тэхнолаг вытворчага аб'яднання. Распрацаваў і ўкараніў у вытворчасць рад навуковых распрацовак па дыпалярнай тэхналогіі інтэгральных мікрасхем на аснове імпульснай фатоннай тэрмаапрацоўкі.

**Піліповіч Уладзімір Антонавіч** (н. 5.1.1931 г. у в. Слабада) — фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. У 1954 г. скончыў Белдзяржуніверсітэт, быў накіраваны на работу ў Інстытут фізікі АН БССР, загадваў лабараторыяй электронікі, з 1973 г. працаваў дырэктарам Інстытута электронікі. Працы па квантавай электроніцы ў дастасаванні да патрэб аптычных метадаў апрацоўкі інфармацыі, паўправадніковай оптаэлектроніцы, спектральна-люмінісцэнтных уласцівасцях аргана-фасфатаў.

**Сітэрман Лазар Якаўлевіч** (н. у 1894 г. у Мазыры) — беларускі вучоны-медык, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі. Скончыў Юр'еўскі універсітэт, ваенны ўрач. Пасля грамадзянскай вайны да канца жыцця працаваў у Мінску галоўным урачом цэнтральнай паліклінікі, загадчыкам кафедры ў Мінскім мед-інстытуце. Працы па пытаннях этыялогіі, клінікі і лячэння сардэчна-сасудзістых хвароб.

Памёр у кастрычніку 1941 г.

**Трызна Сямён Іванавіч** (н. 18.4. 1890 г. у Мазыры) — беларускі вучоны, доктар сельскагаспадарчых навук. Скончыў Кіеўскі універсітэт, у 1924 — 1931 гг. працаваў дырэктарам Палескай пясчана-балотнай доследнай станцыі, затым — загадчыкам аддзела апрацоўкі глеб у НДІ балотнай гаспадаркі УАСГНІЛ. У пасляваенны час — у БелНДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі. Працы па агратэхніцы і селекцыі збожжавых культур на тарфяна-балотных глебах.

**Шляга Мікалай Іванавіч** (н. 1.5. 1935 г. у в. Перадрэйка) — генерал-палкоўнік, да 1992 г. — начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Міністэрства абароны. Скончыў ваеннае аўтамабільнае вучылішча, у 1972 г. — завочную Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС, у 1975 г. — Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. З 1958 г. на камандных пасадах у Савецкай Арміі — камандзір узвода, з 1969 г. на палітычнай рабоце. Працаваў інструктарам, намеснікам загадчыка сектара Аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПСС. У 1987 г. прызначаны загадчыкам сектара Аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПСС, у 1989 г. — намеснікам загадчыка пададдзела Дзяржаўнага прававога аддзела ЦК КПСС. З 1989 г. — першы намеснік начальніка Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, з ліпеня 1990 г. — начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Міністэрства абароны.

**Гальперына Юдзіф Самуілаўна** (н. 5.3.1914 г. у Мазыры) — беларуская і руская актрыса, заслужаная артыстка БССР. У 1937 г. скончыла Беларускую студыю пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе. Працавала ў Беларускім тэатры юнага гледача, Пінскім абласным драматычным тэатры. З 1954 г. у Магілёўскім абласным драматычным тэатры. Характарная актрыса. Ролі: Снежная Каралева ў аднайменнай п'есе Я. Шварца, Негіна ў п'есе А. Астроўскага «Таленты і паклоннікі», Насця ў п'есе В. Вольскага «Несцерка», Лявоніха ў п'есе А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце» і інш.

**Пікман Ізраіль Цурыелевіч** (н. 20.5.1918 г. у Мазыры) — беларускі кінааператар і рэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Скончыў інстытут кінематаграфіі, з 1946 г. працуе на кінастудыі «Беларусьфільм». Зняў мастацкія фільмы «Дзяўчынка шукае бацьку», здымкі якога праводзіліся на Мазыршчыне, «Наперадзе круты паварот», «Вуліца малодшага сына», «Сорак хвілін да світанку». Рэжысёр дакументальных фільмаў «Вясновыя галасы», «Штрыхі да партрэта», «Пастух», «Мы — сінеблузкі», «Я, крэпасць, вяду бой», «Брэсцкая крэпасць», «Мазырскія сустрэчы» і інш.

**Фінберг Міхаіл Якаўлевіч** (н. 21.2.1947 г. у Мазыры) — народны артыст Рэспублікі Беларусь, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Вучыўся ў СШ № 7 і дзіцячай музычнай школе № 1. З 1962 па 1966 г. — выхаванец ваенных аркестраў у Курску і пры штабе БВА, у 1967—1970 гг. — артыст эстраднага аркестра Дзяржтэлерадыё Беларусі. Затым на працягу 17 гадоў Міхаіл Якаўлевіч працаваў галоўным дырыжорам аркестра Мінскага дзяржаўнага цырка.

З 1987 г. — галоўны дырыжор Дзяржаўнага сімфанічнага канцэртнага аркестра Беларусі. Дыпламант 3-х фестываляў «Славянскі базар», лаўрэат прэміі камсамола Беларусі (1990), конкурсу «Лепшы дырыжор» (1995).

*Т. Піліпчук, В. Шур*

**Тры браты — тры вучоныя**

Тры браты, усе тры сыны хлебароба з вёскі Іванкаўшчына Адама Макаравіча Гусака — Аляксей, Сяргей і Мікалай — вядомыя вучоныя: два кандыда


А. А. Гусак


С. А. Гусак


М. А. Гусак

ты і адзін доктар навук, усе прафесары вышэйшых навучальных установ рэспублікі...

У Іванкаўшчыне і цяпер успамінаюць старога Гусака: і хлеб расціў, і калгас арганізоўваў, і радзіму абараняў, і ў вясковым гандлі многа гадоў працаваў. А галоўнае — вырасціў, вывеў у людзі трох сыноў і дзвюх дачок. Ды якіх сыноў! Нібы тры волаты з вядомай казкі. Не ўзялі яны сілай, узялі іншым — розумам, спагадаю, навуковым пошукам...

Мала давялося вучыцца ў свой час Адаму Макаравічу. Двухкласнае народнае вучылішча ў суседніх Мялешкавічах не закончыў, такі час быў, грамадзянская вайна,— не да вучобы. Недахоп ведаў папаўняў самастойна, на курсах «Далоў непісьменнасць». Імкненне да ведаў было такім моцным, што ён не ўяўляў сваіх дзяцей без вышэйшай адукацыі.

Бацькава мара здзейснілася. Трое скончылі універсітэт, двое — інстытуты. Вучоныя — матэматык, філолаг-пісьменнік, фізік, дзве настаўніцы.

«Да вайны паспеў скончыць толькі сем класаў,— успамінае старэйшы Аляксей Адамавіч.— Пасля вызвалення раёна паступіў у Мазырскае педвучылішча. У 1947 г. атрымаў дыплом настаўніка. А хацелася большага...»

Беларускі універсітэт, аспірантура, абарона кандыдацкай, з 1976 г.— прафесар. Звыш 30 гадоў жыццё Аляксея Адамавіча непарыўна звязана з буйнейшай навуковай установай рэспублікі — БДУ, дзе ён — дэкан факультэта, загадчык кафедры агульнай матэматыкі, аўтар больш як 110 апублікаваных работ, у тым ліку 20 кніг па гісторыі матэматыкі, методыцы яе выкладання і г. д. ...

Сцежка ў навуку сярэдняму брату — Сяргею — была ўжо пратаптаная. Філалагічны факультэт БДУ, работа настаўнікам, аспірантура, абарона кандыдацкай, рэктар Брэсцкага педінстытута, аўтар кніг «Аляксей Кулакоўскі» і «Пафас праўды», член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Раптоўная смерць у 40 гадоў абарвала таленавіты шлях...

Зусім было зразумелым, што прыклад са старэйшых братоў возьме і Мікалай... З 1956 г. вучоба на фізічным факультэце БДУ, аспірантура, кандыдацкая і доктарская дысертацыі па праблемах фізікі. Цяпер ён прафесар Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі...

Апусцела бацькоўская хата ў Іванкаўшчыне. Праўда, непадалёку жыве сястра Мальвіна, якая ўсё жыццё вучыла дзяцей аднавяскоўцаў. Але ж гады ідуць. Ужо даўно ржа пабіла косы, якія звінелі калісьці роснымі раніцамі ў руках братоў, што сумавалі ў гарадах па сялянскай працы, але і далёка ад дому родных мясцін ніколі не забывалі.

*М. Капач*

## Яго помніць Палессе

Цэнтрам Мазырскага раёна ў 1926—1927 гг. была вёска Слабада. Межы раёна значна адрозніваліся ад сучасных. Тэрыторыі сучасных Барбароўскага, Міхалкаўскага, Махнавіцкага, Мялешкавіцкага, Скрыгалаўскага і Асавецкага сельсаветаў адносіліся да іншых раёнаў, значная ж частка Калінкавіцкага раёна — да Мазырскага. Менавіта тады ў райвыканкам па размеркаванні Наркамзема рэспублікі прыехаў 18-гадовы выпускнік сельгастэхнікума Міхаіл Кліменка. Працаваў аграномам у райземаддзеле, затым старшым аграномам у Мазырскім райкалгассаюзе. Для падрыхтоўкі кіруючых кадраў калгасаў і саўгасаў на Палессі была створана двухгадовая сельскагаспадарчая школа. Выкладчыкам, намеснікам дырэктара і дырэктарам яе да вайны быў М. А. Кліменка.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Кліменка — дырэктар МТС у Сталінградскай вобласці, з лістапада 1943 г. — намеснік начальніка і начальнік Палескага зямельнага аддзела.

У 1948 г. М. А. Кліменка выбраны на пасаду намесніка старшыні Палескага абласнога выканаўчага камітэта, праз тры гады — старшынёю аблвыканкама. Многа ўвагі ён удзяляў умацаванню ролі мясцовых органаў улады ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Высокім быў аўтарытэт М. А. Кліменкі сярод насельніцтва, яго ведалі ў самых аддаленых вёсках Палесся.

Пасля таго як у 1954 г. была ліквідавана Палеская вобласць, М. А. Кліменка становіцца намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, затым — старшынёй абласнога выканаўчага камітэта. На гэтай высокай пасадзе таленавіты, вопытны кіраўнік працаваў да 1970 г. Ён быў дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі трох скліканняў.

*М. Капач, Л. Шут*

## Пакінуў добры след



А. А. Малафееў

У 1971—1975 гадах Анатоль Аляксандравіч Малафееў быў першым сакратаром Мазырскага гаркама Кампартыі Беларусі. У гэты перыяд асабліва інтэнсіўна рос і развіваўся горад: было пабудавана шмат жылля, школ, узведзена новая бальніца, уступіла ў строй дзеючых першая чарга Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. У працоўныя дасягненні мазыран вялікі ўклад унёс Анатоль Аляксандравіч, таленавіты арганізатар, чулы партыйны кіраўнік.

Яшчэ да Мазыра А. А. Малафееў прайшоў немалы жыццёвы шлях: скончыў чыгуначны тэхнікум, працаваў слесарам, служыў на флоце, зноў вучыўся — у інстытуце народнай гаспадаркі, працаваў у райкаме і абкаме партыі ў Гомелі. Але яшчэ больш маштабнай і плённай была яго дзейнасць пасля Мазыра: з 1975 года ён на адказных партыйных і дзяржаўных пасадах у Гомелі і Мінску, а ў 1990 годзе яго выбіраюць першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі і членам Палітбюро ЦК КПСС.

Мінулі больш як два дзесяцігоддзі з часу, калі Анатоль Аляксандравіч працаваў у горадзе над Прыпяццю, але ўдзячныя мазыране не забываюць таго добрага, што зрабіў ён для горада і раёна. І калі ў 1995 годзе праводзіліся выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, ён быў вылучаны тут кандыдатам у дэпутаты. Мазыране горача падтрымалі праграму, у якой А. А. Малафееў адстойвае інтарэсы чалавека

працы, выступае «за пераўтварэнні грамадства, якія паляпшаюць жыццё людзей».

У 1996 годзе дэпутат ад Мазыра Анатоль Аляксандравіч Малафееў быў выбраны Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

*Т. Пілінчук*

## Воін, спартсмен, выхавацель

І. М. Харашук



Іван Мікалаевіч Харашук у 1940 г. пасля савецка-фінляндскай вайны, у якой ён удзельнічаў артылерыстам, быў звольнены ў запас і вярнуўся ў родны Мазыр. Яго накіравалі ў вучылішча авіятэхнічнай службы. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны пайшлі ваяваць з фашыстамі тры Харашукі — Уладзімір, Юрый і Іван. Уладзімір прапаў без вестак у першыя дні вайны. Загінуў у 1944 г. і Юрый. Іван Мікалаевіч з сакавіка 1942 г. служыў у складзе 95-га авіяпалка Паўночнага флоту, затым — у 9-м Чырванасцяжным Кіркінескім мінна-тарпедным авіяпалку. Ён быў фотаграмметрыстам, рабіў аэрафотаздымкі Нарвегіі, Баранцава мора і інш. У ягоным альбоме і сёння захоўваюцца унікальныя фатаграфіі, сярод іх — гібель фашысцкага лінкора «Цірпітц», лётчыкі 9-га мінна-тарпеднага авіяпалка, аб якіх напісаны кнігі, створаны кінафільм «Тарпеданосцы».

Усё пасляваеннае жыццё Івана Мікалаевіча звязана са спортам. Газета «Североморский летчик» 2 ліпеня 1946 г. пісала: «На параде североморских авиаторов-физкультурников в одной из первых колонн шагал лучший из наших спортсменов-легкоатлетов гвардии старшина т. Хорошук. Известный хорошими спортивными достижениями в прошлых сезонах, т. Хорошук и в этот день показал, что новое заполярное лето он встречает в отличной спортивной форме. Являясь участником многих состязаний, 30 июня гвардии старшина т. Хорошук занял первое место в ВВС по прыжкам в высоту (1 м 55 см), показал отличные результаты по прыжкам в длину, в шведской эстафете и других соревнованиях. Он спортсмен с отличной подготовкой...»

У 1946 г. І. М. Харашук вярнуўся ў Мазыр, працаваў інструктарам у абласным камітэце фізкультуры, з 1954 па 1978 г. быў старшынёй гарадскога камітэта фізкультуры і спорту. Ужо на пенсіі да 1993 г. працаваў дырэктарам стадыёна «Спартак». У 1972 г. І. М. Харашуку прысвоена званне «Заслужаны трэнер Беларусі».

*Т. Пілінчук*

## Чэмпіён свету — з Мазыра

Дзеравянка Леанід Андрэевіч (н. 10.6.1949 г. у Мазыры) — спартсмен і трэнер па грэблі на байдарках і каноэ, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер БССР. Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры, з 1976 г. дзяржаўны трэнер зборнай каманды па грэблі на байдарках і каноэ. Чэмпіён свету на байдарцы-чацвёрцы на дыстанцыі 10 км, бронзавы прызёр чэмпіянату свету на байдарцы-адзіночцы ў эстафеце 4×500 м і чэмпіянату свету і Еўропы на байдарцы-чацвёрцы на дыстанцыях 1 км і 10 км.

## Спартыўная слава

Мазыране паспяхова выступаюць у многіх відах спорту.

Выдатна паказалі сябе на розных

спаборніцтвах грабцы. Пяціразовым чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь стаў студэнт педагагічнага інстытута Мікалай Хільман. Удзельнік Алімпійскіх гульняў у Барселоне Аляксандр Грамовіч — трохразовы чэмпіён рэспублікі. Пераможцамі рэспубліканскіх спаборніцтваў на розных дыстанцыях сталі грабцы Сяргей Яўменаў, Сяргей Казлоў і Надзея Пайграй.

Пасля чэмпіянату рэспублікі па грэблі прайшоў матч дзяржаў СНД, у якім прымалі ўдзел спартсмены Украіны, Узбекістана, Літвы, Латвіі і Беларусі. У гэтых спаборніцтвах перамог на трох дыстанцыях М. Хільман, на дзвюх дыстанцыях першыя — А. Грамовіч і С. Яўменаў, С. Казлоў заняў другое месца. Чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь Надзея Пайграй на першынстве свету па грэблі сярод юніёраў, які праходзіў у Чэхіі, заняла восьмае месца.

Міхась Руцкі ўдзельнічаў у Першай сусветнай велагонцы свету (выступалі спартсмены 35 дзяржаў) і заняў 15 месца. Ён прызнаны самым актыўным гоншчыкам. Міхась Руцкі стаў таксама пераможцам міжнародных спаборніцтваў у Польшчы, чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь. З поспехам выступалі на міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтвах веласіпедысты Марыля Тарасава і Павел Здрок. Яўген Сянюшкін — пераможца па веласпорце на юнацкіх спаборніцтвах дзіцячай алімпіяды ў Галандыі, чэмпіёнамі і прызёрамі рэспубліканскіх спаборніцтваў сталі Віктар Здрок, Аляксандр Казлоў, Андрэй Кардаш, Міхаіл Руцкі.

Барцы Аляксандр Хацкевіч і Анатоль Вараны — пераможцы рэспубліканскіх маладзёжных гульняў.

У маі 1993 г. у Англіі праходзіў чэмпіянат свету па бадмінтоне. Член беларускай каманды мазыранін Алег Маразевіч быў прызнаны адным з лепшых.

Радуе прафесійны рост баксёраў. Пераможцамі маладзёжных гульняў Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнародных турніраў сталі Аляксандр Палуянаў, Вячаслаў Астапенка, Фёдар Яшчанка.

Удзельніцай чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы і ўладальніцай кубка Еўропы сярод клубных камандаў стала Алена Бычкоўская. Срэбныя медалі ў чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па футболе заваявала каманда Мазырскага вытворчага камерцыйнага цэнтра.

Усяго ў Мазыры жывуць і працуюць звыш 50 майстроў спорту. Сярод іх — 5 майстроў міжнароднага класа, 8 заслужаных трэнераў.

*А. Клімаўцаў*

## У родным краі ёсць крыніца...

Гісторыя і прырода Мазыршчыны таленавіта апісаны ў сучаснай беларускай літаратуры. Варта прыгадаць многія творы Я. Коласа, К. Крапівы, І. Мележа, Б. Сачанкі, Р. Сабаленкі, У. Караткевіча, В. Вольскага, М. Капыловіча, Л. Прокшы... Тут пачыналі свой шлях у вялікую літаратуру І. Навуменка, Д. Сергіевіч, У. Верамейчык, У. Краўчанка, І. Капыловіч, А. Бароўскі,— у аснове сюжэтаў многіх іхніх твораў пазнаецца рэальнае жыццё Мазыршчыны. Плённа працуе аб'яднанне мазырскіх літаратараў «Прыпяцкія хвалі», актыўна выступаюць у друку А. Малюк, Ю. Герасіменка, У. Рудзінскі, Г. Дашкевіч, В. Андрыеўскі і іншыя мясцовыя аўтары.

Цудоўнае апісанне Мазыра першых пасляваенных гадоў можна знайсці ў творах Івана Навуменкі, беларускага пісьменніка, які ў 1945—1951 гг. працаваў у абласной газеце «Бальшавік Палесся» і добра ведаў Мазыршчыну. У кнізе «Замяць жаўталісця» ён пісаў: «Гарадок заўсёды быў перанаселены. Але тады, у пасляваенны час, зусім па іншай прычыне. Яго зрабілі абласным цэнтрам, і вузкія вулачкі, прысадзістыя дамкі з цяжкасцю размяшчалі мноства абласных устаноў, арганізацый, якім трэба былі памяшканні, кабіне-

ты, транспарт. На цэнтральнай вуліцы, што пакаta спускалася да Прыпяці, шыльды віселі, бадай, на кожнай будыніне. Вясной, калі на схілах пагоркаў пачынаў раставаць снег, мутны паток імчаў па галоўнай магістралі, нібы па горнай цясніне,— міма дамкоў з шыльдамі, людзей з абшарпанымі партфелямі, якія снавалі ўзад-уперад па вузкай панелі, міма куцых, нібы абрубкі, таполяў з абрэзанымі вярхушкамі. Ледаход на Прыпяці ў трэскі разносіў часовы драўляны мост, якім гарадок звязваўся з астатнім светам, машыны, падарожнікі да самага лета, пакуль не наводзілі новы мост, перапраўляліся на процілеглы бераг на пароме і лодках».

Горад Мазыр не без падстаў называюць сталіцай беларускага Палесся, беларускай Швейцарыяй — за дзівоснае спалучэнне маляўнічых узгоркаў і гор сярод неабсяжных балот у марыве малочна-белых туманоў, лясістых раўнін і вады, якой тут значна больш, чым у іншых кутках Беларусі. Галоўная водная магістраль Палесся — рака Прыпяць, апетая многімі паэтамі і пісьменнікамі. Вось як апісвае яе ў ваколіцах Мазыра Віталь Вольскі: «Залатая восень уладарыць над Прыпяццю ва ўсёй сваёй непаўторнай красе. На адных гарах — дубы і клёны, на другіх — сосны. Ля падножжа гор з'явілася і хутка знікла сяло Барбароў, імя якога ўпамінаецца ў гістарычных дакументах. Тут, на беразе возера, знаходзіўся калісьці вялікі сярэдневяковы замак з высокімі вежамі, валам і ровам... Цячэ Прыпяць шырока, велічна. Дыхае глыбока, на поўныя грудзі. З такім жа эпічным, казачным спакоем цякла яна і ў часы далёкай старажытнасці, і ў гады нядаўніх цяжкіх выпрабаванняў. Так цячэ і ў нашы дні. Шырокія плёсы змяняюцца перакатамі, пясчанымі косамі і водмелямі.

...Прыпяць — самы вялікі прыток Дняпра, самая вялікая і самая суднаходная рака Беларусі. Калі толькі не глянеш на Прыпяць, заўсёды ўбачыш ці цеплаход, ці рудавоз, ці буксір, ці катэр, ці караван плытоў, ці проста маторную лодку... Цяпер, у кастрычніку, глыбіня Прыпяці каля Мазыра невялікая — у асноўным два метры, як сказалі мне воднікі на прыстані. Але вясною, у час паводкі, узровень вады ў рацэ паднімаецца на чатыры. Прыпяць залівае ўсю сваю бязмежную пойму. Тады шырыня Прыпяці дасягае дваццаці — трыццаці кіламетраў. Рака паглынае нізоўі прытокаў, а іх нямала — Піна, Ясельда, Бобрык, Уна, Смердзь, Лань, Случ, Пціч, Іпа і Брагінка з левага боку, Стыр, Гарынь, Ствіга, Убарць, Славечна — з правага. Далёкім мінулым вее ад гэтых старадаўніх, язычаскіх назваў і разам з прытокамі, разам з безліччу малых рэк, ручаёў, азёр і лужын Прыпяць месяцы на два ператварае сярэднюю частку палескай нізіны ў адно вялікае мора.

Славутая рака спрадвеку мела вялікае значэнне ў эканамічным жыцці не толькі Палесся, але і ўсёй нашай краіны. У старажытныя часы сплаўлялі па Прыпяці ў Кіеў плыты з карабельным і будаўнічым лесам, везлі на невялікіх суднах смалу і дзёгаць. У Мазыр прывозілі з Кіева соль і розныя тавары, патрэбныя для насельніцтва Палесся. Прыпяць была адзіным надзейным шляхам, які звязваў Мазыр, Тураў, Пінск і іншыя палескія гарады з поўднем.

Левы бераг вельмі нізкі, плоскі і роўны да самага далягляду. Белыя палосы і плямы пяску, часам вельмі шырокія, відаць здалёку. Яны кантрастна бялеюць на фоне сіняй вады, сіняга неба і зялёных зараснікаў лазы. І над усім гэтым прасторам пануе вялікі, непарушны, бязмежны спакой далёкіх летапісных часоў... Гляджу на шырокія пясчаныя пляжы, што бясконца бялеюць уздоўж берага, і пачынаю разумець, чаму людзі і назвалі гэтую раку Прыпяццю, ці Прыпеццю, як пісалі ў старажытныя часы. У гэтай назве адчуваецца сувязь са словам «прыпеч», якое паходзіць ад дзеяслова «прыпякаць»,

«прыпячы». Так яшчэ і ў нашы дні называюць па Палессі нізкі пясчаны бераг без расліннасці, з усіх бакоў адкрыты сонцу. Тое, што цяпер называем — «пляж». Мабыць, ад слова «прыпеч» атрымала назву вялікая палеская рака...»

З кнігі «Беларускі савецкі нарыс»: «Адзінаццаты дзень падарожжа застаў нас у цудоўным узгоркавым горадзе Мазыры, адным з буйнейшых гарадоў беларускага Палесся. Горад з нечаканасцю вуліц... Дамы-рамантыкі ўзбіраліся на высокія, у дваццаць метраў, грэбні зялёных хваль. І нібы злякнуўшыся такой вышыні, здзіўлена глядзяць на сваіх трохпавярховых суседзяў, як ім там, унізе... Паглядзіш — і галаву міжвольна адкідаеш назад. Прытрымай шапку, падарожнік!

Пагоркі, некалі сабраўшыся ў цэнтр горада, нібы на веча, так і асталіся стаяць. Мазыр — горад сівой даўніны. Ён, які плавіў руду, лавіў рыбу, варыў у смольнях дзёгаць, не памятае, калі нарадзіўся. Як і многія былыя гарапашнікі, што тут жылі. За працай не было яму калі спраўляць дні свайго нараджэння. Адзіная міжвольная метрыка — Іпацьеўскі летапіс — пад 1155 год успамінае, што «тады Георгій прывёў Ізяслава ў Корчаск, а Святаслава Ольгавіча ў Мазыр і, тут уладкаваўшы яго, пайшоў у свой Кіеў».

Здаецца, гісторыя на Мазыршчыне больш, чым у іншых палескіх мясцінах, пакінула сваіх слядоў. Ад тых стаянак першабытнага чалавека ў Жахавічах, Салаўёўцы, Акулінцы да гэтых яшчэ свежых курганоў, насыпаных апошняй вайной, — трыццаці брацкіх магіл...»

*В. Шур*

Мазыру, Прыпяці прысвечаны многія творы беларускіх пісьменнікаў, чыя жыццёвая або працоўная біяграфія звязана з гэтым палескім краем.



**Натхняе родны кут...**

**Бароўскі Анатоль Мікалаевіч** (н. 12.5.1942 г. у вёсцы Крушнікі Мазырскага р-на) — беларускі пісьменнік.

Пасля заканчэння Асавецкай сярэдняй школы (1960) працаваў у калгасе, потым на заводзе жалезабетонных вырабаў у Мазыры, настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Турбінка.

У 1961—1967 гг. — студэнт Мазырскага педагагічнага інстытута.

Працаваў у мазырскай раённай газеце, у гарадской арганізацыі таварыства «Веды», інструктарам райкама і гаркама партыі, намеснікам дырэктара вучылішча геалогіі.

З 1975 па 1991 г. працаваў уласным карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена» па Гомельскай і Брэсцкай абласцях.

Друкуецца з 1963 г. Аўтар кніг аповесцяў і апавяданняў «Каліна пад акном», «Азірніся ў каханні», аповесці «Тросніца» і іншых.

У аповесці «Азірніся ў каханні» шмат старонак прысвечана старажытнаму гораду над Прыпяццю — Мазыру.

Дзень ужо ўбіраўся ў сілу.

Пушкарчук на мокрых прыступках спусціўся ў падвал разбуранага дома. З сабой прыхапіў ліхтарык. Ведаў, што там цемнавата — пазаўчора так і не дабраўся да таго месца, як мерыўся. Злаваў, што нават і сярнічак не прыхапіў з сабою — не курыў.

Ён не хацеў, каб хто быў сведкам яго пошукаў. Таму нейкі час, перад тым як спусціцца ў сутарэнне, аглядваўся.

З-пад апошняй прыступкі ён дастаў малаток і кірку — імі зручней было выбіваць тую цэглу, якую намеціў.

Дом будавалі задоўга да рэвалюцыі. Праёміна была закладзена цэглай знакамітага завода братоў Карповічаў. На тыльным баку цагліны і ініцыялы стаялі «брК». У народным музеі, які ён марыў адкрыць, былі розныя маркі, а вось такой не было. І ён радаваўся, як малое, што набудзе новую рэч.

Нейкі будаўнік кладку рабіў сумленна,— нельга было і падступіцца: ні ломам, ні кіркай не ўгрызешся. Таму першыя цагліны проста выбіў, вытрушчыў, каб можна было асцярожна падступіцца да наступных. Яны паддаліся лёгка — нават і драпінкі на іх не было. Цаглін назбіралася з дзесятак.

За дзіркай было пуста. Цікавасць узяла — а што там, за сцяной? Некалькі ўдараў кіркай — і можна было ўжо прасунуцца ў праёміну.

Перад тым як ступіць туды, у невядомасць, прыслухаўся: было ціха. Толькі даносілася слабае гудзенне машын, што праносіліся па бліжэйшай дарозе.

Адразу ў нос ударыў пах гнілі і сырасці. Святло ліхтарыка выхапіла з цемры шэрыя абрысы наступнай сцяны, ужо каменнай, парослай слізкім шэрым мохам. Са сцяны вываліліся асобныя камяні і звузілі праход — не ўціснуцца. Прыйшлося трошкі папрацаваць, каб прабіць сабе дарогу шырэй.

Ногі ступілі на слізкую каменную падлогу.

Скляпенне было доўгае, метраў з дзесяць. Столь выгнулася дугой. Ушыркі памяшканне было крокаў з пяць-шэсць, не болей. І ніякіх дзвярэй. Ні ўвахода, ні выхаду. Ніякай шчылінкі святла — як пастка.

Што тут было, у гэтым мураваным гроце? Чый ён, каму належаў? Для каго быў зроблены? Напаткала расчараванне — нічога добрага для сябе не адшукаў. Хацелася толькі абмацаць кожны камень, дакрануцца рукой.

Пра сутарэнні Пушкарчук ніколі не чуў. Год назад ён праглядваў у музеі матэрыялы пра горад. Прачытаў, што некалі, пяцьсот гадоў назад, на гары стаяў каралеўскі замак. Яго два ці тры разы перабудоўвалі, але ў час вялікіх паўстанняў і пажараў ён быў знішчаны і ніколі не аднаўляўся...

Малюнкаў ці якіх накідаў гісторыя не пакінула. І таму ніхто не ведаў, як ён выглядаў.

Памяць выхапіла з летапісу некалькі радкоў: «...таго ж року 1506 зноўку зкупіўшыся татар 30(л) тысяч уторгнулі ў літоўскую зямлю, бурачы, палячы і пляндруючы, якія, прыцягнуўшы да Клецка каля замка сталі кошам. Загоны распусцілі, а Літва яка будучы ад паганых зубажоны толькі ся ледзьве 10 тысяч сабраўшы, ударылі па кошу. З помачы божай якіх пагрaмілі із лукамі прыходзячых да коша білі, мардавалі і ўсіх нагалаву разграмілі. А гетманам над Літвою быў князь Міхайла Глінскі».

Праз два гады горад быў захоплены князем, які перайшоў служыць да Вялікага князя Маскоўскага Васіля Іаанавіча. Але потым чамусьці нечакана быў вернуты да Сігізмунда І.

А праз трынаццаць гадоў горад быў спалены татарамі...

Ці не да тых часоў належаць гэтыя скляпенні?

Пушкарчук раптоўна для сябе адкрыў выснову: тут, у скляпенні, і думалася інакш, чым там, на святле. Да драбніц успаміналася гісторыя — і тады чуўся лязгат коп'яў і дзідаў аб шлемы, свіст вострых стрэлаў.

Вялікі пажар у горадзе прымусіў прызначыць спецыяльны збор. І ўжо на пачатку 1613 года ўмацаванні горада былі адноўлены, пры гэтым горад быў абнесены высокім валам з сямю вежамі і фортамі...

Замак адыгрываў тады вялікую ролю ў жыцці палешукоў. На яго тэрыторыі знаходзіліся цэрквы і касцёлы. Гісторыкі і летапісцы сцвярджалі, што ўмацаванні і падземныя схроны існавалі яшчэ дзесяць — дваццаць стагоддзяў назад...

Замак, ці гарадзішча старажытнага горада, знаходзіўся ў яго цэнтры — на Спаскай, а пазней Замкавай гары. Месца палешукі-дрыгавічы выбралі ўдала — ведалі ў гэтым толк. Над рэчкай, з абодвух бакоў абмежаванай глыбокімі і шырокімі канавамі. Праз іх ворагу нельга было прабрацца. Што ўяўляў тады каралеўскі замак? Першы ўспамін пра яго адносіцца да 1519 года, калі Вялікі князь Сігізмунд аддаў «у заставу замак папу Альбрэхту Марцімавічу Гаштальду... за 1500 коп грошай».

Пушкарчук тады не ўтрымаўся, перапісаў у свой сшытак скупыя паведамленні гісторыка, каб самому ведаць і памятаць даты таго часу. Тады яны зацікавілі не вельмі, а вось цяпер гісторыя набывала нейкую рэальную значнасць.

Першы вядомы інвентар адносіцца да 1552 года. Аб тым часе гаворыць «Калодзеж» — такі летапіс. «У замку... 30 сажняў углыб, і месцэ зруйнавана... а рабіў яго нейкі Міхаіл Гашын, стараста і гараднічы Прыпяцкі... а як збудавалі — стаіць 70 гадоў».

Было вядома яшчэ, што замак быў з трох вежаў з гароднямі і некалькімі дамамі паміж імі, якія выконвалі ролю сцен.

«Вежа варотная старая... Па правы бок той вежы дзве гародні старых, за імі — 4 новых зроблены ў тры сцяны... За імі — дом цёсаны, ні печаў, ні каміноў, ні лаў... За тым домам — вежа на вуглу замка, у чатыры сцяны, у сем гмахаў... Па другі бок той вежы — дом другі тым жа чынам зроблены, не скончаны... ад таго дома да трэцяе вежы гародзен новых дзесяць... Вежа на вуглу ад паркана. Адна гарадня новая і восем старых. У замку: царква святога Спаса на падрубе, святліца і камора для гараднічага. Яшчэ камора, два свірны і жытнік. Хата чорная і піўніц дзве...» Ведаў Пушкарчук, што была яшчэ царква святога Міколы.

Рукі абмацвалі кожны камень сцяны. Было жаданне дакрануцца да гісторыі, адчуць яе дыханне.



## «Таемнасцю вабіць жыццё...»

**Басуматрава Святлана Міхайлаўна** (н. 22.11.1946 г. у Мазыры) — беларуская паэтэса. Друкуецца з 1966 г., аўтар зборніка «Белая Бярэзіна», «Далеч-далячынь» і іншых паэтычных кніг. Лірычныя героі яе кніг, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці, няўдачы і памылкі, знаходзяць у сабе сілы для таго, каб паверыць у чалавечую дабрыню, вышэйшую справядлівасць, бессмяротнасць чалавецтва.

МАЛАДОСЦЬ, ЗАТРЫМАЙСЯ

По мазырскай
Абветранай вуліцы
Я спяшаюся
Лёгкай хадой.
...Зноў аб'явяць
Даверлівай публіцы
Паэтэсай мяне
Маладой.

Што ж, няхай,
Выглядаць маладзейшымі —
Натуральная
Мэта жанок.
Маладосць жа пацвердзіцца
Вершамі:
Я знайду
Адпаведны радок.

Ў год,
Калі былі травы няскошаны
Ля пакутнай
Палескай ракі,
Прыляцеўшы
Нязвана-няпрошана,
Адляцелі
Мае сакі.

Мо ў хвіліны апошнія,
Цяжкія,
Як на горкую стану
Мяжу,
Прыйдуць словы
Скупыя і важкія,
Як астатнія кроплі
Дажджу.

А пакуль
У душы маёй весніцца
І таемнасцю
Вабіць жыццё,
Шчодра словы ў радку маім
Цесняцца,
Кружыць іх, быццам вір,
Пачуццё.

Незнаёмы
З нудою і стомаю,
Пеніць май
У садах сырадой...
Будзем жывы,
Шчэ траплю ў вядомыя.
Мне пабыць бы даўжэй
Маладой!



## Улюбёны ў Прыпяць

**Верамейчык Уладзімір Міхайлавіч** (н. 1.11.1937 г.) — беларускі паэт. Вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы, з 1955 г. на педагагічнай рабоце, быў настаўнікам Міхалкаўскай школы. Друкуецца з 1955 г., выдаў зборнікі вершаў «Прыпяць», «Яснасць», «Люблю», «Клянуся Прыпяцю». Многія творы паэта прысвечаны Мазыру і яго людзям. Уладзімір Верамейчык — часты госць у рабочых калектывах і навучальных установах Мазыра.

Асабліва шчыра ён любіць прыгажуню Прыпяць, Мазыр, які прывольна раскінуўся на ўзгорках...

МАЗЫР

Ля Прыпяці дужай спыніўся,
Пад шум прыбярэжнай лазы
Да самай вады нахіліўся
Мой сонечны горад Мазыр.

Садоў панадпрыпяцкіх квецень
Шугае у вокны дамоў,
Вызвоньваюць пчолы над вецщем
Адвечную песню без слоў.

Мне сорам і кветку адную
Сарваць на красе гарадской,
Здаецца, дакоры пачую
Ад вуліц, абходжаных мной.

Мой горад, цябе я пакінуў,
Каб тут, на граніцы, без сну,
Шынелем сваім штохвілінна
Прыкрыць твой спакой і вясну.

Мой горад, вярнуся я ўлетку
З далёкіх краёў, дзе служыў.
І веру: з садоў тваіх кветку
Сумленна я тут заслужыў.

МАЗЫРСКІ КІРМАШ

Пахне сырадоем і цыбуляю,
Агуркамі з роснае грады.
Ліпай і калодкавымі вуллямі
Пахнуць наздраватыя мяды.
На бязмене з гіраю-цаглінаю
Важыць сала хітраваты дзед.
Сонна водзяць выгнутымі спінамі
Шчупакі ў калодзежнай вадзе.
Тут патэльні з жоўтаю яечняю,
Дудкі, капялюх на галаву.
У кашах лазовых рэжуць клешнямі
Ракі вірлавокую траву.
Вось каробак з маладымі вішнямі —
Слаўная лубовая сям'я.
Падмiргне гандлярачка увішная —
І за банку плоціш утрая.
Дзед з Міхалак словамі таропкімі
Прапануе яблыкі з кулак.
А пахваліш жытнікі салодкія,
То насыпле яблыкаў і так,
Тут люблю хадзіць, глядзець гадзінамі,
Слухаць гоман роднае зямлі.
І такое ўчую тут часінамі,
Што нідзе не купіш за рублі.



## Час сплочваць даўгі

**Капыловіч Іван Іванавіч** (н. 2.2. 1944 г. у в. Забалаццe Мазырскага р-на) — беларускі пісьменнік. Маці — настаўніца ў роднай вёсцы, бацька ваяваў — спачатку ў адным з партызанскіх атрадаў Палесся, а пасля вызвалення быў мабілізаваны ў Савецкую Армію і загінуў на фронце.

Сярэднюю школу Іван Капыловіч адольваў у суседняй вёсцы Рамязы, скончыў яе з залатым медалём і паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ імя Леніна. Пасля універсітэта быў накіраваны на работу карэспандэнтам у газету «Чырвоная змена». У час адной камандзіроўкі на Палессе трапіў у аўтакатастрофу, на ўсё жыццё застаўся інвалідам першай групы.

Але маладосць, прага да жыцця, да творчасці дапамаглі Івану Капыловічу вярнуцца ў строй, ён стаў пісьменнікам. У кнігарнях рэспублікі адна за адной пачалі з'яўляцца яго кнігі: «Сонца садзіцца ў травы», «Бяроза на мяжы», «Асенні гром», «Сны не вяртаюцца», «Імянны гадзіннік», «Пасынак».

На Мазыршчыне бязлітасна смаліла сонца. Травы, бульбоўнік, палеткі кукурузы, буракоў павыгаралі да таго, што здавалася, яшчэ дзень-два гэтакай засухі — і ўсё загіне. На душы Міхаіла Саўчыка, старшыні калгаса «Радзіма» не надта радасна: а калі і сапраўды не будзе дажджу ні заўтра, ні паслязаўтра?

Стаяла сярэдзіна ліпеня. Распачалася ўборка: спалавелі, наліліся цяжкім коласам жыта, ячмень, пшаніца. Аб'язджаючы палі, Саўчык прыкідваў, колькі возьмуць ячменю, пшаніцы, ці не давядзецца наступнай вясною бедаваць ад бяскорміцы.

## Пяць мірных дзесяцігоддзяў

Неўпрыкмет наблізіліся да шашы Мазыр — Лельчыцы, па абодва бакі якой — палі і выпасы калгаса «Радзіма». Пасля доўгага маўчання Саўчык прагаварыў:

— У мінулыя гады такая сухмень здаралася, але дужа рэдка. Цяпер жа — як правіла. Чаму? Меліяратарам трэба сказаць дзякуй...

Дарма спяшаліся палешукі прымаць у абдымкі меліяратараў. Бо тое, што сталася з Чэртнем ды і не толькі з ім, інакш як варварствам назваць нельга. Рэчышча Чэртня выпрамілі, зрабілі роўненькім, і адразу ж ён змялеў, стаў вераб'ю па калена, а ўлетку і зусім перасыхае, так што і вераб'ю няма дзе напіцца.

Добра памятаю, як яшчэ хлапчуком разам з маці па нейкай патрэбе на рэйсавым аўтобусе ехалі ў Мазыр. На Палессе прыйшоў красавік, і драўляны масток праз Чэрцень затапіла-заліло вадой, змыла насціл. Шафёр прытармазіў, выбраўся з кабіны, зняў з галавы шапку-шасцiклінку, пашкроб патыліцу: «Ёры-моры, не перабрацца праз етую прорву, патонем».

І тут нехта з пасажыраў заўважыў на старой алешыне, што стаяла на беразе рэчкі, глушца. Ён быў вялікі, прыгожы, з пышным хвастом і чорненькім грэбнем і нікога не баяўся — сядзеў на верхавіне і быццам пазіраў на тое, што рабілася каля мастка...

Цяпер праз Чэрцень пабудавалі новы мост — надзейны і трывалы — жалезабетонны, не раўня колішняму, драўлянаму. Заўсёды, калі я бываю на Палессі, то спыняюся на гэтым мосце. Кожнага разу ў такія хвіліны мяне агортвае сум ад навакольнай здзічэлай цішыні: Чэрцень амаль высах, на месцы колішняга лазовага кустоўя жаўтапесак, як у пустыні. А мне ўсё мроіцца альха з глушцом на верхавіне, хмары дзікіх качак, што пралялі нізка-нізка над балотам, кнігаўка, што кружыла недзе ў высі і абуджала наваколле сваім «кігікігі»... На месцы зялёнага аазіса — пустка.

Саўчык выказвае думку, што сухмень, якая апошнімі гадамі здараецца на Палессі даволі часта, няйнакш з-за таго, што асушылі вялікія і малыя балоты, бо яны ж акумуліравалі ваду, стваралі мікраклімат. Дый лес. Хіба не дасталося яму?

Калі ён згадаў пра лес, то ў маіх вачах паўстала родная вёска. Колісь вакол яе стаялі-шумелі бары, гаі, дубровы. У які бок ні пойдзеш — усюды лес, лес... А сёння? Як ставіліся да навакольнага багацця кіраўнікі? Старшыні калгасаў да самага апошняга былі не з мясцовых, прыезджыя. А ў іх адно наўме: выслужыцца перад вышэйшым начальствам. Дзеля гэтага трэба былі добрыя паказчыкі, і кожны старшыня імкнуўся са скуры вылузацца, праўдамі і няпраўдамі лез у перадавікі... У калгаснай касе не хапала грошай. Не бяда, затое быў лес. Апошні старшыня не выключэнне. Быццам ён і вывеў з адстаючых калгас у маёй роднай вёсцы, але няма ў мяне павагі да яго. За гады старшынёўства ён павыцярэбліваў многія дзіўныя куточкі, дзе раслі бук, граб, таўшчэзныя кляны...

А чарнобыльская бяда? Хіба яна не дакацілася да палёў і лугоў «Радзімы»? Адразу ж пасля пажару на чацвёртым блоку Чарнобыльскай АЭС мясцовае кіраўніцтва пераконвала ўсіх, што на Мазыршчыне ўсё добра, ніякай лішняй радыяцыі і ў паміне няма. Нехта ў пацвярджэнне такой думкі нават пусціў чутку, што Мазыр быццам стаіць на ружы вятроў і таму ўсе нягоды, звязаныя з Чарнобылем, абышлі «сталіцу» Палесся і яе навакольныя лугі, палі, лясы. Людзі верылі, ім хацелася верыць у такі цуд, ім не хацелася пакідаць абжытыя іх дзядамі і прадзедамі мясціны. Але ж... Напрамую да Чарнобыльскай АЭС ад Мазыра ўсяго восемдзесят кіламетраў, і тыя, хто хоць трохі разумеў, што гэта за штуковіна атам, дужа сумняваліся, пачалі звязваць вузлы і лавіць у газетах аб'явы, дзе патрэбна рабочая сіла. Такіх лічылі панікёрамі, але іх станавілася ўсё больш і больш. Асабліва сталі пакідаць Мазыр пасля таго, як у некаторых калгасах і саўгасах у сцельных кароў пачалі з'яўляцца выродкі-цяляты: з галавой большай за тулава, з нейкімі двайнымі шыямі, без вачэй... Тыя, хто гэта ўбачыў сваімі вачыма, кінулі добраўпарадкаваную кватэру, у чарзе на атрыманне якой стаялі не адзін год, і папёрліся куды вочы глядзяць...

*З кнігі «Зона бяды», 1990*



## За ціхай цёплай рэчкай

**Прокша Леанід Януаравіч** (н. у 1912 г.) — беларускі і рускі пісьменнік. У 1955 г. скончыў ваенна-палітычную акадэмію. У 30-я гады працаваў настаўнікам на Мазыршчыне (в. Кустаўніца), з 1937 г. — у рэдакцыях газет і часопісаў. Друкуецца з 1937 г. Аўтар зборнікаў памфлетаў «Інтрыгі прэзідэнцкага двара», «Візітная картка народа», гумарыстычных апавяданняў «Не ў тым поездзе».

Памёр у снежні 1994 г.

У дакументальнай аповесці «За Добрыцай-рэчкай» Л. Прокша на дакумен-

тальнай аснове паказвае будаўніцтва гіганта на Палессі — Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода.

...Ёсць на Палессі невялікая рэчка Добрыца. Выцякае яна з крыніц за вёскай Кустаўніца. На другім канцы вёскі крынічная вада Добрыцы ўпадае ў большую рэчку — Нараўлянку, а тая недзе пад Нароўляй — у Прыпяць. Далей, у шырокай рацэ, плыве добрыцкая вада ў слаўны Днепр і праз усю братнюю Украіну, стольны горад Кіеў — у Чорнае мора.

Больш паўтысячы гадоў таму назад пасяліліся ў гэтым глухім кутку Палесся тры браты: Міцька, Санька і Косця. З гадамі вокал іх сяліб выраслі вёскі: Міцькі, Санюкі і Кустаўніца. Вякамі цішыню над Добрыцай парушалі стук молата ў кузні, сякеры на зрубе, цапоў на таках, скрып непадмазаных колаў, клёкат буслоў, дуда пастуха на досвітку, а ў святочныя дні гукі бубна, скрыпкі і цымбалаў.

У пачатку дваццатага стагоддзя ў гэтыя прывычныя гукі раптам уварваўся рэзкі гук матора. Карэта, у якой сядзеў пан Горват, рухалася па дарозе без каня... Старыя людзі, якім давялося бачыць такое дзіва, з усмешкай успамінаюць цяпер той аўтамабіль. Прайшоў час, і стала не навіной бачыць кустаўняка на сваім аўтамабілі.

За Добрыцай пачыналася дарога на Міхалкі, адтуль шлях з прысадамі бяроз паўз вёскі Бібікі, Тварычаўку, Раеўскія, Матрункі, Бабраняты, Бабры вёў у Мазыр, горад, вядомы з дванаццатага стагоддзя. Да рэвалюцыі 1917 года выходзілі на гэты шлях усе, каму цесна і галадна было ў роднай хаце. За вёскамі бедалагі азіраліся на саламяныя стрэхі і вандравалі ў свет, як крынічная вада з Добрыцы, і губляліся ў людскім моры. А потым прыходзілі пісьмы: «Гарую глыбока пад зямлёю», «Узялі мяне ў служанкі»... і рэдка — «вучуся...».

Але самыя вялікія падзеі за ўсё існаванне Кустаўніцы пачаліся з канца шасцідзесятых гадоў. За Добрыцай разгарнулася будаўніцтва завода-гіганта. Палескую глуш парушыў гул бульдозераў, скрэпераў, самазвалаў. Пра вялікую будоўлю загаварылі па радыё, тэлебачанні, у газетах. І стала вядома ўсёй краіне назва вялікай палескай вёскі, у якой давялося і мне некалі жыць і працаваць...

Бабры.

— Бабры? — За драўлянымі хацінамі віднеліся дамы і краны над імі.— Дык гэта мы ўжо за Мазыр выехалі?

— Яшчэ не. Цяпер Бабры — горад. У гэтых дамах будуць жыць нафтавікі. А той вялікі гмах — вучылішча геолагаў.

Выскачылі на шырокую асфальтавую дарогу. Па ёй амаль упрытык рухаліся нагружаныя пяском, гравіем, жалезам, бетонам магутныя самазвалы, трактары з прычэпамі.

— Гэта дарога на Міхалкі? — не перастаю пытацца.

— На Міхалкі. Там жа вузел нафтаправода «Дружба», і там пачынаюцца тры яго лініі: адна ў Венгрыю, другая — у Чэхаславакію, трэцяя — у Польшчу і Германію. А непадалёку, у раёне Рэчыцы і Ельска, ідзе здабыча беларускай нафты. Таму і выбралі гэта месца над Прыпяццю пад будаўніцтва завода.

— А тут,— Леанід Уладзіміравіч ківае ў бок шырокага поля,— ля вёскі Раеўскія, знайшлі багатыя залежы спажыўнай солі.

Вякамі палешуку не ставала солі. Па гэтай жа дарозе ў ваенныя гады мужыкі ехалі ў горад, каб выменяць соль на сала, муку, бульбу. А яна ляжала побач, у зямлі...

У пачатку трыццатых гадоў я не раз тупаў па гэтай дарозе. Абапал яе шумелі разгалістыя старыя бярозы. Пасярод так званага кацярынінскага шляху, у сыпучым пяску, ішла каляя, пракладзеная калёсамі. Ідзеш, бывала, стомішся, прысядзеш адпачыць пад бярозай і сумна ўглядваешся, ці не пакажацца якая фурманка. А цяпер вунь гудуць, равуць машыны, аж зямля дрыжыць. Не думаў я, ды і не мог думаць, што такое будзе тут, на Мазырскім Палессі. Сам на ўроку гаварыў вучням, стоячы ля карты (зрэшты, тое, чаму нас вучылі): «Бедны наш край. Няма ў нас ні нафты, ні каменнага вугалю, ні жалезнай руды, ні солі». Аказваецца, ёсць! У нас, на Беларусі, нафта! Гэтая звестка ўсхвалявала і гарапашных старых эмігрантаў, якія да рэвалюцыі з беднай Беларусі выехалі шукаць хлеба за акіян...



## У сны прыходзіць Радзіма

**Федарэнка Андрэй Міхайлавіч** (н. 17.1.1964 г. у в. Бярозаўка Мазырскага р-на) — беларускі пісьменнік. Вучыўся ў Мазырскім палітэхнікуме, працаваў мулярам. Дэбютаваў у 1987 г. у часопісе «Маладосць» апавяданнямі «Сачыненне» і «Пісьмо». У 1990 г. скончыў Мінскі інстытут культуры. Працуе загадчыкам аддзела ў часопісе «Полымя». Друкаваўся ў калектыўных зборніках «Жнівеньскі праспект», «Перад маімі вачыма», «Гісторыя хваробы».

Член саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 1991 г. за апавяданне «Пеля» атрымаў першую прэмію на Усесаюзным літаратурным конкурсе «Молодые дарования». Лаўрэат прэміі тыднёвіка «Літаратура і мастацтва» за апавяданне «Бляха» (1992) і літаратурнай прэміі імя Івана Мележа за кнігу прозы «Смута» (1995).

У творах Андрэя Федарэнкі, насычаных складанай сацыяльнай праблематыкай, багата прадстаўлены наш палескі пейзаж, пра што сведчыць і ўрывак з ягонага апавядання «Пеля».

Стаяла ноч.

Час ад часу я ўсхопліваўся, хапаў палку, кідаўся то ў адзін бок, то ў другі. Палка лезла ў прорву. Твар распух ад камароў; ад іхняга звону, ад густога балотнага паху, ад укусаў п'явак і ад нерваў у мяне кружылася галава. Чужым, сіпатым голасам я пачаў гаварыць да балота:

— Ты хочаш, каб я тут здох... Але я выжыву, мне проста смешна!.. Я ж усё роўна за гэтую ноч не змянюся, ніяк яна на мне не адаб'ецца... Ты папсуеш матцы здароўя за гэтую ноч, паламаеш мне лета — вось і ўсё, самае большае... Нават і лета не паламаеш — я знайду занятак, хоць платы параблю! І я плюю на цябе, смурод, гадзючнік,— мала вас паасушалі!.. У мяне яшчэ ўсё наперадзе, я ўбачу новыя гарады, новае жыццё,— я буду жыць, а ты — смярдзець тут, зарастаць, пакуль не высахнеш к чорту!..

У адказ мне толькі звінела, чмокала, булькала, і калыхаўся такі густы туман, што яго відаць было нават у цемры.

Раніца надышла надзіва хутка. Ужо ў сярэдзіне ночы без сонца пачало святлець, паменела камароў, зашчабятала птушка. Я змог разглядзець ваду, свае ногі, кусты. Пасярод пелі плавала вудка, ад якой разбіваліся дробныя хвалі — карась тармасіў... Здранцвелымі нагамі, паўз саменькую ваду, каля ямкі, якая ўчора ледзь не стала маёй магілаю, я выбраўся на свой учарашні след і хутка быў ужо на сухім беразе. На пелю мне не хацелася нават азірацца...

Цяпер, праз пэўны час, ужо не сорамна ўспамінаць, як каля самай сваёй хаты ўмудрыўся заблудзіцца і ледзь ацалеў. Але і не смешна. Пажыў я за гэтыя гады «новым жыццём», пабачыў новыя гарады, нават у Крым з'ездзіў. А згадваюцца чамусьці не інтэрнатаўскія пракураныя скразнякі, не аднастайныя, на ноч, бязрадасныя п'янкі, не блуканні па чужых кватэрах, калі баішся прызнавацца гаспадарам, якія баяцца радыяцыі, што родам — з Гомельскай вобласці... Пеля згадваецца.

Можна сказаць — ну і што, дужа нам цікавая твая настальгія па нейкіх балотах.

А я скажу: тым летам атрад наш быў расфарміраваны, бо на другі дзень па прыездзе, у Крыму, аўтобус, які вёз студэнтаў на вінаграднік, урэзаўся ў скалу. Адзін чалавек загінуў і два асталіся калекамі. Мог я сярод іх апынуцца? І калі гэта выпадковасць, дык што ж тады — наканаванне?

Радзіма мая — вёска, балота... Няўжо і цяпер я яшчэ нешта значу для цябе, няўжо і цяпер ты абараняеш мяне ад нечага? Нашто ж ты ўсё часцей і часцей прыходзіш у думкі, ва ўспаміны, у сны, і так упарта, кожнай травінкаю з пасохлых пеляў — не адпускаеш?..

## Героі і ахвяры

І ў мірны час здалёку і зблізку прыходзіла ў нашы хаты вялікае гора. Тут, на Палессі, не рваліся бомбы і снарады, не стракаталі аўтаматы і кулямёты, але недзе, за многія тысячы кіламетраў...

Па рашэнні ЦК КПСС і Савецкага ўрада ў канцы 1979 г. на тэрыторыю Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан былі ўведзены савецкія войскі. Гісторыя дасць канчатковую ацэнку афганскай вайне, але, якою б ні была гэтая ацэнка, ніколі не забудуцца гераічныя подзвігі нашых воінаў у далёкай краіне. Учарашнія вучні, студэнты, рабочыя і калгаснікі цаною ўласнага жыцця ратавалі сваіх сяброў, верныя салдацкай клятве, праяўлялі непахісную сілу волі і духу. Не ўсе вярнуліся з той вайны. Васьмярых сваіх юнакоў не дачакалася і Мазыршчына.

Звыш 200 воінаў-афганцаў жыве цяпер у горадзе і раёне. Большасць з іх добрасумленныя працаўнікі, паважаныя людзі. Яны памятаюць сваю баявую маладосць, не забываюць загінуўшых сяброў.

Не забудзе Мазыршчына і тых, хто ў розныя пасляваенныя гады загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-марскога флоту. Помнім мы і адважных мі-